УДК 821.161.3

***Генадзь Праневіч***

# МАСТАЦКІ ВОБРАЗ І СІНКРЭТЫЧНЫЯ ФОРМЫ ВЫЯЎЛЕННЯ ЗМЕСТУ Ў “СЛОВЕ АБ ПАЛКУ ІГАРАВЫМ”

Досліджуються різноманітні форми образно-виражального синкретизму “Слова о полку Ігоревім”, пов’язані із сутністю так званого “родового образу” і особливостями середньовічного сприйняття та художнього трактування автором історичних подій.

**Ключові слова:** синкретизм, родовий образ, плазмовий стан, турбулентність, композиція, тотожність.

**Pranevich G. An Art Image and Sincritical Forms of Presentation of Content in “a Word of Igor’s Regiment”.** In the article various forms of graphic-imaginary syncretism of “A word about Igor’s regiment” are examined, they are connected with essence of a “family imagine” and particular features of medieval perception and art interpretation of historical events by the author.

**Key words:** syncretism, family appearance, plasma state, turbulence, composition, identity.

*Актуальнасць* абранай тэмы палягае на тым, што з’ява сінкрэтызму як універсальнага спосаба арганізацыі мастацкага зместу “Слова аб палку Ігаравым” і канкрэтныя формы яго праяўлення ў творы практычна не даследаваны ў сучасным “словазнаўстве”, што абцяжавае вытлумачэнне ідэйнага зместу твора і ягоных “цьмяных месцаў”, характару аўтарскага мыслення, прынцыпаў кампазіцыі і унікальнай мастацкай прыроды помніка.

*Мэтай* аўтарскага даследавання з’яўляецца раскрыццё на прыкладзе “Слова аб палку Ігаравым” разнастайных формаў сярэднявечнага сінкрэтызму як асноўнага рэсурса мастацкай вобразатворчасці і выяўлення гістарычнага зместу помніка.

Сінкрэтызм з’яўляецца неад’емнай атрыбутыўнай рысай старажытнага помніка. Ён не толькі пранізвае ўсю мастацкую структуру твора, арганізуе ўсе ягоныя элементы ў адзінае цэлае, але даводзіць яе да вышэйшага стану мастацкай звышправоднасці, параўнальнага з станам плазмы. Энцыклапедычны слоўнік тлумачыць гэтую фізічную

*© Праневіч Г., 2008*

з’яву наступным чынам: *“Плазма (ад грэч. plasta – выляпленае, афармленае) − іанізаваны газ, у якім канцэнтрацыя дадатных і адмоўных іонаў роўная (квазінейтральнасць). У стане П. знаходзіцца пераважная частка рэчыва Сусвету: зоркі, галактычныя туманнасці і міжзоркавая прастора”* [1, 1005].

Для нас найважнейшае ў гэтай дэфініцыі якраз тое, што паняцце плазмавага рэчыва, што знаходзіцца ў сферы ўздзеяння высокіх тэмператур, ціску, гравітацыйных сіл і электрамагнітных палёў і адлюстроўвае ў сваёй фізічнай прыродзе іх складаны баланс, як найлепш стасуецца да характарыстыкі наскрозь сінкрэтычнай мастацкай структуры помніка ў стане найвышэйшай актывізацыі ўсіх яго выяўленчых рэсурсаў, калі ў стане вобразна-інфармацыйнай звышправоднасці і насычанай энергетыкі мастацкага слова знікаюць і разбураюцца ўсе фармальныя бар’еры і перашкоды, адбываецца свабоднае бесперашкоднае ўзаемадзеянне ўсяго з усім, ўзнікае эффект своеасаблівага плазмавага свячэння, празрыстасці тэксту, у якім прасветлены, вытлумачаны і гарманічна ўраўнаважаны ўсе яго элементы, што ствараюць у творы вышэйшую мастацкую тоеснасць.

Якраз дзякуючы сваёй сінкрэтычнай плазменнай прыродзе мастацкі вобраз набывае ў “Слове” цэлы шэраг невідочных магнетычных рэсурсаў, накшталт *турбулентнасці,* якая ўзнікае ў разрэджанай міжтэкставай прасторы помніка, арганізаванага ў выглядзе цэласна завершаных рытміка-інтанацыйных рытарычных фігур-тырад, размежаваных сэнсавымі, псіхалагічнымі і метрычнымі цэзурамі, якія і складаюць аснову мастацкага рэчытатыву і магічнай гравітацыйнай сілы помніка, якая як бы зацягвае чытача ў вір падзей і перажыванняў, ашаламляльных відовішчаў, якія адлюстроўваюць нечаканыя павароты аўтарскай думкі, калейдаскапічную змену мастацкіх планаў, перспектывы, аб’ектаў і ракурсаў паказу, напрыклад, як у сцэне ўцёкаў князя Ігара з палавецкага палону: *“Погасоша вечеру зори. // Игорь спитъ, // Игорь бдитъ, // Игорь мыслию поля меритъ // отъ великаго Дону до малаго Донца. // Комонь въ полуночи Овлуръ свисну за рекою; // велить князю разумети: // князю Игорю не быть! // Кликну, // стукну земля, // въшуме трава, // вежи ся половецкии подвизашася. // А Игорь князь поскочи // горностаемъ къ тростию // и белым гоголемъ на воду. // Въвръжеся на бръзъ комонь // и скочи съ него бусымъ влъкомъ. // И потече къ лугу Донца, // и полете*

*соколомъ подъ мьглами, // избивая гуси и лебеди // завтроку, // и обеду, // и ужине"* [2, 392].

Родавы, сінкрэтычны па характары вобраз з'явіўся асноўным сродкам арганізацыі мастацкага зместу такога насычанага, скандэнсаванага, шматпланавага твора, як "Слова аб палку Ігаравым".

У цэлым жа ў мастацкай структуры "Слова аб палку Ігаравым" можна вылучыць некалькі яскравых структурных узроўняў і формаў сінкрэтызму.

Так, напрыклад, ёсць усе падставы гаварыць аб *родавым і жанрава-відавым сінкрэтызме* "Слова", пад якім мы разумеем родавую і жанравую нявычлененасць, недыферынцыраванасць помніка, ў якім літаратурныя роды – эпас, лірыка і драма – выступаюць непадзельна і ўзаемадзейнічаюць паміж сабой як раўназначныя, свабодна спалучаныя і перацякальныя адна ў адну сутнасці.

Так, ужо эпічны пачатак твора, у якім расказваецца аб "першых часах" Рускай зямлі і яе князях, апетых вешчуном Баяна, суправаджаецца суб'ектыўнымі аўтарскімі перажываннямі, заўвагамі і ацэнкамі, у якіх выказваецца нязгода з вялікім папярэднікам-песнятворцам, жаданне аўтара ісці сваім шляхам – пець "по былинамь сего времени…". І ў далейшым аўтар пастаянна ўмешваецца ў хаду падзей сваім лірычным каментарам і перажываннямі: "*О Руская земле! Уже за шеломянемъ еси!*" [2, 381], "*То было въ ты рати и въ ты плъкы, а сицей рати не слышано!"* [2, 383]; выказвае свае адносіны да герояў, напрыклад, да Усяслава Чарадзея: "*Аще и веща душа въ дръзе теле, нъ часто беды страдаше"* [2, 390]. Ці проста ўключае ў тэкст свайго твора цэласныя разгорнутыя лірычныя маналогі кшталту язычніцкага малення Яраслаўны да прыродных стыхій ветру, Дняпра-Славуціча і сонца [2, 391].

Пры гэтым у эмацыянальна-экспрэсіўнай сказавай манеры аўтара выяўляецца перманентная тэндэнцыя да драматызацыі, калі поруч з аўтарскім голасам натуральна гучаць маналогі і дыялогі герояў, якія ўтвараюць у творы мастацкае шматгалоссе, у якім зліваюцца галасы воінаў, іржанне коняў, прамовы князёў перад бітвамі, плачы рускіх жанок і воінскія славы, што ўтвараюць агулам як бы адну вялікую сцэнічную пляцоўку пад адкрытым небам.

Тое ж датычыцца і жанрава-відавой прыроды помніка, які утрымлівае ў сабе відочныя прыкметы самых разнастайных жанраў:

летапісу, паэмы, аповесці, малення, славы, плачу і інш. Нездарма сам аўтар, акрэсліўшы ў загалоўку жанр твора як ***„слова”***, пазней быў вымушаны ўвесь час папраўляцца ў тэксце, называючы яго то песняй, то аповесцю, напрыклад: *„Начатися же ся тъй* ***песни*** *по былинамь сего времени…”;* альбо *„Почнемъ же, братие,* ***повесть*** *сию отъ стараго Владимира до нынешняго Игоря”* [2, 378] .

Апроч гэтага, можна гаварыць аб тым, што кампануючы часткі твора ў адзінае мастацкае цэлае, невядомы аўтар выразна кіраваўся ў сваёй пісьменніцкай справе прыёмамі і прынцыпамі царкоўна-храмавага дойлідства, беручы за аснову кампазіцыі мадэль крыжова-купальнага храма і ўжываючы пры гэтым вядомыя тагачасным дойлідам прапорцыі паміж кампазіцыйнымі часткамі тэкста, блізкія да “залатога сячэння” (сам тэрмін уведзены Леанарда да Вінчы значна пазней, у XУ стагоддзі. – *Г. П.*), вядомага як знакамітая прапорцыя пяці да трох (5/3), васьмі да пяці (8/5), трынаццаці да васьмі (13/8) і г. д. [1, 467]. Прычым, як зазначае Б. А. Рыбакоў, „цікавасць да прапорцый залатога сячэння ўзмацнілася у рускіх дойлідаў з другой паловы XII стагоддзя, асабліва яскрава выявіўшы сябе ў царкве Пакрова на Нерлі” [3, 110]. Гэта значыць – якраз у эпоху стварэння „Слова аб палку Ігаравым”.

Следаванне дойлідскім прынцыпам царкоўна-храмавага будаўніцтва яскрава выявілася найперш ў структурнай кампазіцыі твора, які нагадвае план шматкупальнага саборнага храма з яго асноўнымі традыцыйнымі часткамі: уваходам, прытворамі, раўналеглымі бакавымі крыжападобнымі нішамі, якія выконваюць функцыю контрафорсаў, надаючы будынку ўстойлівасць, сіметрычнасць і раўнавагу.

Ансамблевы характар старажытнага твора як з’арыентаванага на дойлідскі ўзор сабора святой Сафіі ў Кіеве выявіўся не толькі ў яго складанай разгалінаванай кампазіцыі з шматлікімі адступленнямі-успамінамі, разгалінаваным сюжэтам і фабульнымі лініямі, але і дакладна прадубліраванай структурай купальнай сістэмы храма, у якой адлюстраваліся ідэя палітычнага адзінства Рускай зямлі, цэнтралізавана-іерархічны характар духоўнай і свецкай вялікакняжацкай улады ў Кіеўскай Русі, заснаванай на прынцыпах супадпарадкавання і феадальнага васалітэту.

Так, 13 купалам кіеўскай Сафіі ў „Слове аб палку Ігаравым” дакладна адпавядае „залатое слова” вялікага кіеўскага князя Святаслава, звер-

нутае да 12 удзельных князёў, што ў суме дае тую ж самую лічбу – 13. Пералічым іх паіменна: 1) Ігар Святаславіч; 2) Усевалад; 3) Яраслаў; 4) Вялікі княжа Усеваладзе; 5) Рурык; 6) Давыд; 7) Галіцкі Асмамысл Яраслаў; 8) Раман; 9) Мсціслаў; 10) Інгвар; 11) Усевалад; 12) "усе тры Мсціславічы", названыя па бацьку як *адно* сямейнае гняздо. І, нарэшце, трынаццатая па ліку – постаць самога вялікага князя Святаслава, суадносная з самым вялікім і высокім купалам Сафіі, які сімвалізуе веліч і былое іерархічнае адзінства ўсёй Рускай зямлі, што знайшло сваё яскравае ўвасабленне і ў апошнім безасабова-абагульненым закліку вялікага князя да нашчадкаў Яраслава Мудрага і Усяслава Чарадзея спыніць міжусобную варажнечу.

Такое пластычнае зліццё ідэйнага і вобразна-выяўленчага плана наглядна дэманструе арганічную *тоеснасць* у „Слове" вобраза і яго ўнутранага зместу, прадмета і ўкладзенай у яго сэнсавай ідэі, у аснове якой ляжаць пэўныя зыходныя, базавыя вобразы-архетыпы, матывы і г. д., ступень зрошчанасці, з якімі і вызначае ўзровень мастацкага сінкрэтызму твора.

Менавіта традыцыямі архаічнага родавага мыслення, згодна з якімі ўсе падзеі маюць абарачальны, цыклічны характар, а таму цяперашняе і будучае можа быць зразумета, вытлумачана і прадказана мінулым, абумоўлены і шматлікія праявы так званага *наіўнага гістарызму*, звязаныя з накладваннем і аб'яднаннем у вобразе "Слова" адразу некалькіх пластоў гістарычнага часу, а таксама збліжэннем па аналогіі і падабенству самых розных падзей, герояў і інш., якія часта фігуруюць у помніку пад адной і той жа самай моўна-гукавой абалонкай, г. зн. недыферынцыравана.

Напрыклад, падзеі, звязаныя з выкраданнем Алены і Траянскай вайной, эпізодам з траянскім канём пры асадзе Троі і інш., вядомыя на Русі па творах Гамера і перакладных хроніках Іаана Малалы, накладваюцца на падзеі ўсходнеславянскай гісторыі, служаць ілюстрацыяй да „траянавых вякоў" Кіеўскай Русі, што наступілі ўслед за падзелам дзяржавы паміж трыма сынамі Святаслава – Уладзімірам, Яраполкам і Алегам, сватаўством Уладзіміра і гвалтоўным здабыццём ім Рагнеды-нявесты, якая была абяцана Яраполку. З гэтых жа гістарычных аналогій паўстае ў „Слове" і характарыстыка Рускай зямлі, ахопленай міжусобіцамі і войнамі паміж "трима ярославичами" і полацкім князем Усяславам, як „зямлі Траянавай": *„Уже бо, братие,*

*не веселая година въстала, // уже пустыни силу прикрила. // Въстала обида въ силахъ Дажьбожа внука, // вступила* ***девою на землю Трояню****, // въсплескала лебедиными крылы // на синем море у Дону"* [2, 384].

Заўважым, што падзеі, звязаныя з вераломным паланеннем Усяслава Чарадзея і наступным вызваленнем полацкага князя і ўскняжаннем яго на кіеўскім пасадзе, таксама асэнсоўваюцца ў творы ў кантэксце таго ж самага сюжэта траянскай вайны, звязанага з парушэннем Парысам-Аляксандрам клятвы аб адкрытай і сумленнай бітве з царом Менелаем і наступным захопам і разбурэннем грэкамі Троі пры дапамозе хітрасці з канём. Пры гэтым аўтарская алюзія відочна ўтрымлівае і аб'ядноўвае ў сабе два матывы: матыў помсты за колішнюю знявагу і выкраданне Рагнеды і разбурэнне полацкага пасаду Уладзімірам; і матыў справядлівага пакарання князёў-„траянцаў", пераступіўшых цераз клятву і крыжацалаванне, ускняжаннем Ўсяслава на кіеўскім пасадзе: *„На седьмомъ веце Трояни // връже Всеславъ жребий // о девицю себе любу. // Тъй клюками подпръ ся о кони // скочи къ граду Кыеву // и дотчеся стружиемъ // злата стола киевьскаго"* [2, 390].

Збліжэнне і, можна нават сказаць, атаясамліванне так аддаленых у часе дзвюх падзей сусветнай гісторыі зусім невыпадковае, паколькі падзеі, пакладзеныя ў аснову „Слова", відавочна былі ўспрыняты яго аўтарам як містычны люстраны адбітак падзей, звязаных з разбурэннем Троі. Асабліва, калі ўлічыць, што ад нулявой даты нараджэння Хрыста, якая дала пачатак новай, альбо як мы называем, нашай эры, разбурэнне Троі і трагічны Ігараў паход на полаўцаў аддзяляюць роўна 1184 гады. Такое сімвалічнае супадзенне не магло не выклікаць ў аўтара думкі аб наканаваным Божым Промыслам колазвароце часу і містычнай повязі падзей. Падзей, разгорнутых, аднак жа, цяпер па волі Хрыста, які адкрыў перад усім хрышчоным чалавецтвам новую перспектыву жыцця, зусім у іншым, чым гісторыя антычнай язычніцкай Троі, кірунку. Вынік якіх, зноў жа якраз у адпаведнасці, з той адваротнай перспектывай, якую стварае люстраны адбітак, вызначае вера ў Хрыста і гуманістычныя каштоўнасці хрысціянства.

Змест „Слова" дае дастаткова падстаў на карысць гэтай гіпотэзы, паколькі новая, хрысціянская канцэпцыя гісторыі, прадстаўленая ў „Слове" аўтарам, відавочна супрацьстаіць у помніку язычніцкай канцэпцыі цыклічнага часу, згодна з якой час і падзеі паўтараюцца, а нашчадкам наканавана наследаваць традыцыі, учынкі і лёс продкаў.

Якраз у гэтым і заключаецца асноўны сэнс палемікі і творчай дыскусіі, якую вядзе з сваім папярэднікам, славутым Баянам, аўтар „Слова”, які абвяшчае, што будзе пець па-новаму, гэта значыць *“по былинамь сего времени, // а не по замышлению Бояню”* [2, 378].

Згодна з старой язычніцкай канцэпцыяй гісторыі, якой, відаць, прытрымліваўся і даўнейшы Баян, няцвёрды ў веры напаўязычнік-напаўхрысціянін князь Ігар павінен быў паўтарыць лёс сваіх продкаў і родзічаў, прадвесцем смерці для многіх з якіх было сонечнае зацьменне. Такі лёс напаткаў, напрыклад, дзеда Ігара – Алега Гарыславіча, які *„мечемъ крамолу коваше и стрелы по земли сеяше”*, пры якім *„сеяшется и растяшеть усобицами, // погибашеть жизнь Даждьбожа внука”* [2, 383], а таксама каля дзесятка продкаў і блізкіх сваякоў Ігара [4, 154−155].

Магчыма, што такі ж самы знак быў некалі і князю-язычніку Ігару Старому, які паўторна вярнуўся за данінаю і быў забіты абуранымі драўлянамі (заўважым тут, што ідучы ізноў на разбітых ушчэнт і дарэшты абрабаваных прошлай вясной рускімі князямі полаўцаў, Ігар Святаславіч фактычна як бы паўтарае трагічную памылку свайго вялікага продка і цёзкі).

Ігару аднак удаецца перапыніць гэтую страшную родавую традыцыю цаною хрысціянскага пакаяння і разрыву з паганымі, адмаўлення ад братазабойчых звад і міжусобіц. У выніку, *„Игореви князю богъ путь кажеть изъ земли Половецкой на землю Рускую, къ отню злату столу”* [2, 392], а ягонае выбаўленне з „тьмы разделения нашего” завяршаецца ў творы сімвалічным вобразам заззяўшага над Рускай зямлёй сонца і шляхам героя да храма Багародзіцы Пірагошчай:

*Солнце светится на небесе, −*
*Ігорь князь в Руской земли;*
*Девицы поютъ на Дунаи, −*
*Вьются голоси чрезъ море да  Киева.*
*Игорь едет по Боричеву*
*къ святей богородици Пирогощей* [2, 394].

Такім чынам, арыентацыя аўтара „Слова” на традыцыі і магчымасці сінкрэтычнага светаразумення і светаадчування, а таксама ідэйная карэкціроўка і пераасэнсаванне іх з пазіцый новага, хрысціянскага светапогляду, дазволілі аўтару зрабіць мастацкі вобраз твора максімальна скандэнсаваным, насычаным, шматзначным, незвычайна

ўшчыльніць і ўзбагаціць асацыятыўную базу вобраза, узмацніць камунікатыўныя сувязі паміж рознымі кампазіцыйнымі часткамі, забяспечылі абсалютную свабоду ў развіцці сюжэта, новых тэм і фабульных ліній.


***Літаратура***

1. Советский энциклопедический словарь: 3-е изд.– М.: Сов. энцикл., 1984.– 1600 с.
2. Слово о полку Игореве: Древнерусский текст и переводы / Сост., вступ. ст., подгот. древнерус. текста и коммент. В. И. Стеллецкого.– М.: Сов. Россия, 1981.– 288 с. (Далей у тэксце ў дужках падаюцца спасылкі на старонкі гэтага выдання).
3. Рыбаков Б. А. Из истории культуры древней Руси. Исследования и заметки.– М.: Изд-во Моск. ун-та, 1984.– 240 с.
4. Робинсон А. Н. Автор “Слова о полку Игореве” и его эпоха // Слово о полку Игореве. 800 лет: Сб.– М.: Сов. писатель, 1986.– С. 153−191.



УДК 821.161.3−1.09



***Світлана Шчэрба***


# МАДЭРНІСЦКІЯ ТЭНДЭНЦЫІ Ў БЕЛАРУСКАЙ ПАЭЗІІ 20-Х ГАДОЎ ХХ СТАГОДДЗЯ ( НА ПРЫКЛАДЗЕ ТВОРЧАСЦІ М. ГРАМЫКІ, М. ЧАРОТА, У. ДУБОЎКІ)


Разглядаюцца мадэрнісцкія тэндэнцыі ў беларускай паэзіі 20−30-х гадоў. Звяртаецца ўвага на такія кампазіцыйныя прыёмы як мантажная кампазіцыя, кампазіцыйнае кальцо, сінтаксічны паралелізм. На падставе аналізу мастацкіх твораў робіцца вывад, што мадэрнізм садзейнічаў развіццю новых жанравых форм у беларускай літаратуры.



**Ключавыя словы:** мадэрнізм, тэндэнцыі, жанр, мантаж, сінтаксічны паралелізм, кальцо.



**Шчерба С. Модерністські тенденції в білоруській поезії 20-х років ХХ ст. (на прикладі творчості М. Грамикі, М. Чарота, У. Дубовкі).** Розглядаються модерністські тенденції в білоруській поезії 20–30-х років. Беруться до уваги такі композиційні прийоми, як монтажна композиція, композиційне коло, синтаксичний паралелізм. На основі аналізу художніх творів зроблено висновок, що модернізм сприяв розвитку нових жанрових форм білоруської літератури.



**Ключові слова:** модернізм, тенденції, жанр, монтаж, синтаксичний паралелізм, коло.



*© Шчэрба С., 2008*